*Да 110–годдзя з дня нараджэння Лукаша Калюгі*

# Зоры з–за крат

**Нашы літаратары часта звяртаюць увагу на абсалютную «неэратычнасць» беларускай прозы першай паловы XX стагоддзя. Тагачасныя пісьменнікі мала дбалі пра стварэнне вытанчаных, глыбока псіхалагічных гісторый кахання — і мелі на гэта свае прычыны. Але няма правіл без выключэнняў: кожны абазнаны чытач можа згадаць яскравы беларускі твор пра вялікія пачуцці. На маю думку, адна з самых запамінальных гісторый кахання хаваецца ў кнізе Лукаша Калюгі «Творы», выдадзенай у 1992 годзе ў серыі «Спадчына».**

*Алеся Лапіцкая*

Лукаш Калюга — псеўданім Кастуся Вашыны, адметнага беларускага празаіка 1920–х гадоў. Гэты псеўданім падаецца вельмі вясковым — і сапраўды, малады аўтар шмат пісаў пра вясковыя стасункі, адметных сялян, народныя міфы, абмалёўваючы цікавую, каларытную беларускую вёску, раскрываючы асаблівасці сялянскага светапогляду. Кастусь Вашына нарадзіўся 27 верасня 1909 года ў вёсцы Скварцы (цяпер у Дзяржынскім раёне Мінскай вобласці) і добра ведаў жыццё традыцыйнай беларускай вёскі. Яго творы друкаваліся ў часопісе «Узвышша» ў той час, калі адны айчынныя аўтары, следам за Максімам Горкім, разважалі пра «ідыятызм вясковага жыцця», а іншыя па зацверджаных трафарэтах акрэслівалі радасны шлях сялян у шчасную савецкую будучыню.

Але гісторыя кахання Лукаша Калюгі зусім не вясковая, падобная да гісторый з апавяданняў кшталту «Баркаўцы — добрая вёска і баркаўчане — вясёлыя людзі» хіба толькі шчырасцю аўтара. Па стылі яна больш нагадвае прозу Юрыя Алешы — яго знакаміты раман «Зайздрасць» Лукаш Калюга перакладаў на беларускую мову. Малады пісьменнік захапляўся яшчэ і французскай прозай, з задавальненнем чытаў Кнута Гамсуна, Юрыя Тынянава, Яраслава Гашака…

Натуральна, гісторыя кахання, якая ўражвае чытача, — гэта гісторыя сапраўднага, «рэальнага» кахання, якое глыбока перажываў сам пісьменнік. У «Творах» гэтая рэальная гісторыя раскрываецца адразу ў трох вымярэннях: мы знаходзім яе ва ўспамінах Ніны Казлоўскай, якая вучылася з Лукашом Калюгам у Беларускім педагагічным тэхнікуме (адной з найлепшых тагачасных навучальных устаноў), у лістах, напісаных пісьменнікам у высылцы — у горадзе Ірбіце ў 1935 годзе, і ў аповесці «Зоры Вам вядомага горада», створанай прыкладна ў той самы час. З гэтых трох тэкстаў гісторыя кахання Лукаша Калюгі паўстае ва ўсім драматызме, але расчытаць яе адразу не атрымаецца.

Калі з лістамі і кароткай прадмовай спадарыні Ніны дастаткова пазначыць патрэбныя старонкі, то «Зоры Вам вядомага горада» — твор даволі заблытаны. Паслядоўнасць, у якой апублікаваны часткі аповесці, верагодна, адпавядае арыгіналу — але зусім не развіццю сюжэта. Укладальнікі кнігі пранумаравалі часткі твора — і гэтая нумара-

Яго творы друкаваліся ў часопісе «Узвышша» ў той час, калі адны айчынныя аўтары, следам за Максімам Горкім, разважалі пра «ідыятызм вясковага жыцця», а іншыя па зацверджаных трафарэтах акрэслівалі радасны шлях сялян у шчасную савецкую будучыню

цыя падаецца правільнай ці, прынамсі, найбольш верагоднай. І вось аповесць пачынаецца часткай пад нумарам 5, а далей ідуць часткі 7, 12, 10, 13, 15, 18… Пры чытанні трэба кіравацца нумарацыяй і гартаць старонкі сюды–туды, таму цэласнае ўспрыманне з'яўляецца не адразу…

Не цяжка здагадацца, што Лукаш Калюга пісаў у дзіўнай паслядоўнасці, каб пільным супрацоўнікам спецслужб было больш складана зразумець сэнс аповесці. Бо «Зоры Вам вядомага горада» — не толькі кранальная гісторыя кахання, але і самы смелы твор у нашай літаратуры пра ўзмацненне ідэалогіі і цэнзуры, цэнтралізацыю ўлады, пашырэнне ў грамадстве падазронасці і недаверу, напісаны (падкрэслім!) сучаснікам тых падзей, чалавекам маладым, назіральным, кемлівым. Калі разблытаць твор і некалькі разоў перачытаць у правільнай паслядоўнасці, можна атрымаць выдатнае ўяўленне пра адмоўныя тэндэнцыі, якія мелі месца ў 1928–1931 гадах — час вучобы Лукаша Калюгі ў Белпедтэхнікуме. Кастусь Вашына быў прадстаўніком беларускай моладзі, якая сталела, бадай, у самы спрыяльны час — з непахіснай верай у будучыню сваёй краіны, поўнай упэўненасцю ў вартасці беларускай культуры і выдатным усведамленнем таго, наколькі важная для чалавека свабода. Таму героі згаданай аповесці Лукаша Калюгі — маладыя мастакі — непрыхільна ставяцца да сходаў, дзе *«вечны тлум і ні на кроплю шчырасці ў тым, аб чым чэшуць языкі»*, дзе навязваюць *«зацверджаны і прыняты для кіраўніцтва»* падыход да выяўлення рэчаіснасці і занадта цікавяцца асабістымі справамі студэнтаў.

Лукаш Калюга, па ўспамінах сябра Франца Гінтаўта, захапляўся мастацтвам, наведваў падчас вучобы гурток, якім кіраваў вядомы мастак Уладзімір Кудрэвіч. Таму меў добрае ўяўленне пра тое, што піша. Пісьменнік добра ведаў і працу на Беларускім радыё, куды «ўладкаваў» аднаго з герояў сваёй аповесці. Па заканчэнні тэхнікума Лукаш Калюга два гады працаваў літаратурным рэдактарам у навукова–даследчым інстытуце прамысловасці, пасля — на Беларускім радыё. Праўда, зусім нядоўга...

Галоўны герой «Зор Вам вядомага горада» мастак Алесь звяртае ўвагу на прыгожую дзяўчыну — аднакурсніцу Алену. Яна мае артыстычную,

## Гісторыя кахання Лукаша Калюгі паўстае ва ўсім драматызме, але расчытаць яе адразу не атрымаецца

зменлівую натуру: спачатку вучылася ў тэатральным тэхнікуме, потым кінула вучобу на мастацкім, бо пачала працаваць натуршчыцай. У жыцці студэнтаў здараюцца першыя непрыемнасці, у пакоі ўсё часцей робіцца хмурна… Але ёсць і радасныя падзеі: аднойчы сябар Алеся прыходзіць разам з Аленай, Алесь пачынае маляваць дзяўчыну і прызнаецца ў даўнім каханні. Неўзабаве Алесь і Алена пачынаюць жыць разам:

*«Проці шчасця на ўзгорку ад гэтых дат пасяліўся ён. Толькі гэта — чыстая метафарычнасць. Так ён і застаўся на таей ваколіцы. Яны толькі да часу жылі паасобку. Алена на тую ваколіцу не хацела пераязджаць, бо хутка звальнялася кватэра, дзе яны жылі. Яе сваякі кудысьці выязджалі, дык трэ было не пратраціць, а гэта лепш — значна бліжэй да цэнтра.*

*Баюся толькі, што з кампазіцыйнаю загаданаю — вельмі куртаты будзе гэты раздзел: не знойдзецца ў ім аб чым пісаць, бо шчасце — спакой, шчасце — калі нічога больш не трэба, калі ўсе жаданні спраўджаны. Ад тых дат з разнастайнага было хіба тое, што рознымі імёнамі Алесь Алену называў».*

Ідылію парушае Трэці, які загадвае аддзелам афармлення выданняў. Алесь малюе вокладкі для кніг, Алена спаганяе ў выдавецтвах авансы і надта часта заседжваецца ў загадчыка...

Злавесны Трэці (або Янка Брацькавіч) — правільны кіраўнік, які *«аднекуль з–пад Масквы проста гатовы быў прысланы сюды загадваць»* і *«паводзіўся з людзьмі вельмі ўладарна, як паводзяцца ў заваяванай краіне»*. Вельмі сэнсоўнае атрымалася апісанне гэтага героя: ён быў *«прыгожы геаметрычным нейкім прыгаствам» — «маладым яшчэ, а ўжо бародку меў, як у правадыроў якіх — клінком. <…> Твар яго не багат быў на адценні: ўсяго толькі дабраякасная сур'ёзнасць і аптымістычная, абавязковая для ўсіх газетных фатаграфій, усмешка па чарзе праходзілі па ём, а так — нічога лішняга!..»*

Алена бярэ шлюб з Трэцім — больш паспяховым і забяспечаным у параўнанні з Алесем. Але неўзабаве мастаку шанцуе з выставай і каханая вяртаецца да яго. У фінале Трэці памірае ад разрыву сэрца — так кранае яго вестка пра жончыну здраду. Калі ж Трэцяга анатамуюць, то бачаць, што гэта робат: *«Зверху сінтэтычны каўчук найпярвейшага гатунку, а далей алюміній і іншы лёгкі метал»*. Зроблены робат быў на маскоўскім заводзе. *«Ды чаго тут не разумець?! Робіць жа Галівуд гукавыя фільмы для розных краін на іхніх жа мовах, дык чаго тут М з–ду не дагнаць»*, — жартуе аўтар.

Фантастычную гісторыю пра Трэцяга пісьменнік распавядае вельмі лёгка, з іроніяй, бо поспехі ў робатабудоўлі — адзін з папулярных матываў тагачаснай савецкай літаратуры. Увогуле, лаканічная, іранічная аповесць «Зоры Вам вядомага горада», якая не мае пачатку і, па сутнасці, з'яўляецца не завершаным творам, а накідамі–нататкамі, успрымаецца вельмі добра. Але найбольш кранае гэты твор, калі чытаць яго разам з лістамі Лукаша Калюгі да Ніны Казлоўскай.

Бо ў жыцці пісьменніка гісторыя кахання была больш простай, нават прадказальнай і адначасова — нашмат больш сумнай. Каханая Лукаша Калюгі вучылася разам з ім, але стала не натуршчыцай, а настаўніцай, іх блізкія стасункі былі вельмі кароткія і, разам з тым, давалі падставы маладому творцу спадзявацца на далейшыя доўгія дачыненні. Але ў лютым 1933 года Лукаш Калюга — следам за многімі сваімі паплечнікамі: Уладзімірам Дубоўкам, Язэпам Пушчай, Антонам Адамовічам — быў арыштаваны і высланы ў горад Ірбіт (цяпер у Свярдлоўскай вобласці Уральскай федэральнай акругі Расійскай Федэрацыі). З гэтага невялікага халоднага гарадка Кастусь дасылаў каханай доўгія лісты. Успамінаў надвячоркі, дакараў за доўгае маўчанне, пісаў пра нязменнасць пачуццяў і радасныя лятункі:

*«Сам хачу гэтаксама быць тваім шчасцем… Хачу, каб мяне на ўсю цябе хапіла. Калі будзе мала, вымотаю апошнія магчымасці. А не выстарчыць іх, карай тады мяне. Варт буду гэтага й падпарадкуюся твайму справядліваму гневу. Толькі я ўпэўнен за сваю маладосць, за сваё каханне. І не гнеў спадзяюся заслужыць у цябе, а пяшчотную ўдзячнасць.*

*Толькі ўсё гэта… так далёка, што адно галава круціцца, зірнуўшы ў ягонае прадонне. А хацелася б сарвацца з верхавін сузірання й ляцець — у прадонне, у жах… Хоць разбіцца, а ляцець. Кінематаграфічнаму герою ў такіх выпадках бываюць падрыхтаваны радасныя абдымкі. А што мне?.. Што мне?!. — каханая мая, незабытная, пяшчотная Нінусенька!»*

На час напісання гэтых радкоў — у жніўні 1935 года — мінула амаль два гады з дня апошняй сустрэчы Ніны і Кастуся. І на Радзіме далёка не ўсе верылі ў вяртанне выгнаннікаў. Неўзабаве Ніна паведаміла, што мае сям'ю і нарадзіла дачку. Лісты, напісаныя ў той час, дазваляюць зразумець, як складана было пісьменніку: ён дакараў каханую, але не хацеў яе крыўдзіць, разумеў, што трэба трымацца годна, усведамляў незваротную страту і, разам з тым, цапліў у душы кволае спадзяванне… Ён рабіў самому сабе кампліменты (у тым ліку за *«цуды стылістыкі»*, якія трапляюцца ў аўтографах), доўга каментаваў фотаздымкі Ніны, развітваўся з ёю і адначасова пісаў пра сваё непазбыўнае каханне:

*«А ўсё ж кахаю Вас. Не зважаючы ні на што. І толькі кіўні, я твой буду, буду каля цябе — усіх кіну, усяго выракуся…*

*Усё нічога не значыць. Буду рад Вам пасля ўсяго. Ніводным словам ніколі не зраблю закіду»*.

Калі Кастусь Вашына быў у роспачы ад лістоў каханай і зноў і зноў думаў пра разбітыя пачуцці, то ў «Зорах Вам вядомага горада» ён адшукаў уяўнае выйсце, зрабіўшы суперніка робатам. Страта каханай рабілася часовым непаразуменнем, памылкі лёгка выпраўляліся… Аповесць мела аўтабіяграфічны характар, таму ў твор амаль даслоўна патрапілі некаторыя ідэі з лістоў

Аповесць пачынаецца часткай пад нумарам 5, а далей ідуць часткі 7, 12, 10, 13, 15, 18… Пры чытанні трэба кіравацца нумарацыяй і гартаць старонкі сюды–туды, таму цэласнае ўспрыманне з'яўляецца не адразу

## Ідылію парушае Трэці, які загадвае аддзелам афармлення выданняў. Алесь малюе вокладкі для кніг, Алена спаганяе ў выдавецтвах авансы і надта часта заседжваецца ў загадчыка...

Лукаша Калюгі: думкі пра ўласную залішнюю арыгінальнасць, спадзяванне высока пагайдаць дачушку сваёй каханай і атрымаць *«дзіцячую мокрую “буську”»*, мары пра спатканні на сузор'і Воз:

*«Пра адзіноту, як пра турму ўсё роўна, і чытаць нудна, і пісаць што можна пра яе цікавае? Але ў астрозе, як і ў адзіноце, ёсць шмат магчымасцей; напрыклад: можна прызначыць спатканне на сузор'і Воз.*

*Воз было выбрана як самае папулярнае.*

*Алесь прасіў Алену не пазніцца. Пад раніцу вельмі слізка на сузор'і Воз. І таму, што яно куляецца. А калі далей развіваць параўнанне, дык слізка — бо гразка, а гразка — то ўжо восень будзе, і ад таго (ад восені) прыкра, холадна…*

*Алена не прыходзіць на сузор'е Воз. Алесь чакае марна. Вандруе адзінокі. А з зоркі на зорку пераскочыць гэта не тое, што на балоце з купіны на купіну — трэба добра разагнацца, дый сінь тая жахлівей за ўсякую багну перад табою й пад табою ззяе.*

*Гэта не выйшла. Тады Алесь іншым спосабам прабуе.*

*Ён знаходзіць на дарозе балаголскую пугу. Гэта даволі рэдкая знаходка, калі такія частыя сталі аўтамабілі. Тую пугу ён называе бізуном, каб страшней было. Ніколі з гэтым не займаўся, а то піша верш: як яе муж бізуном лупсуе. Верш выйшаў, вядома, дрэнны».*

У аповесці «Зоры Вам вядомага горада» нямала лірычных фрагментаў: ёсць тут і шчырыя разважанні пра творчасць, пра натхненне, якому спрыяе адзінота, пра рамантычныя прафесіі, пра непрадказальнасць прыгожых дзяўчат. Але калі б пісьменнік меў час на дапрацоўку, аповесць, напэўна, атрымалася б яшчэ больш прачулай. Таму супярэчлівыя, шчымлівыя, роспачныя, надзвычай эмацыянальныя лісты да Ніны ў пэўным сэнсе дапаўняюць аповесць, чытаюцца як адна няпростая гісторыя.

Ліставанне працягвалася, але не давала палёгкі: *«Выходзіць так: нібы мы развіталіся і разышліся, а потым я даганяю цябе, бо мне пільна патрэбна нешта сказаць табе. Далей высвятляецца, што нічога пільнага няма — я проста хачу яшчэ пагаварыць з табою, проста — мне не хочацца, цяжка быць без цябе… Якраз яно гэтак!»*

6 лістапада 1935 года Лукаш Калюга быў зноў арыштаваны, асуджаны да пяці гадоў пазбаўлення волі, 2 кастрычніка 1937 года — расстраляны па прысудзе Чалябінскага суда.

*«Пра тое, што Лукаш зноў арыштаваны і засланы ў канцлагер, даведалася з ліста яго сябра (адзінага ліста) і маленькай запіскі памерам з карабок ад запалак, напісанай на папяроснай паперы: “Табе і Радзіме ніколі не здраджу”. Гэта апошнія радкі–клятва, якія ён пакінуў мне»*, — успамінала Ніна Казлоўская.

Яна не толькі пранесла праз усё жыццё памяць пра Кастуся, але і далучылася да выдання яго твораў: разам з Аленай Шарахоўскай расчытвала творы Лукаша Калюгі, напісаныя алоўкам на адваротным баку канцылярскіх дакументаў. Больш за паўстагоддзе ў спадарыні Ніны захоўваліся лісты Кастуся — і дзякуючы яе вялікай смеласці былі апублікаваныя.

Аповесць, лісты, успаміны — гэта не толькі гісторыя кахання, гэта сведчанне вялікай трагедыі, якая адбылася ў 1930–я гады: страта блізкіх людзей, туга па Радзіме, марныя спадзяванні, безвыходная роспач… Чытаючы гэтыя тэксты, у пэўны момант востра разумееш, наколькі складаны, супярэчлівы і чулы кожны чалавек, які падаецца кампетэнтным органам нявартай увагі адзінкай, што так лёгка закрэсліць…

Няхай чытач выбачае за падрабязны пераказ сюжэта, але ў лістах і аповесці засталося яшчэ безліч цікавага: арыгінальныя думкі, трапныя дэталі, успаміны паміж радкоў і, вядома, «цуды стылістыкі», асабліва каштоўныя для пісьменніка. Творы, напісаныя Лукашом Калюгам у высылцы, можна зноў і зноў перачытваць і знаходзіць для сябе нешта новае — як і мае быць з сапраўднай літаратурай. А пагартаць кнігу Лукаша Калюгі, выдадзеную ў серыі «Спадчына», вельмі проста — дастаткова зайсці на сайт «Беларуская палічка».